СМЕРЦЬ НЯМЕЦКІМ АКУПАНТАМ!

# ПАРТЫЗАНСКАЕ СЛОВА

ЛІСТОЎКА-ПЛАКАТ

№ 5 ЖНІВЕНЬ 1943 г.

ВЫДАННЕ ВІЛЕЙСКАГА АБКОМА КП(б) БЕЛАРУСІ

## ДА ПОМСТЫ!

Нямецка-фашысцкія полчышчы зазналі сілу новых сакрушальных удараў нашай гераічнай Чырвонай Арміі. У загадзе Вярхоўнага Галоўнакамандуючага Маршала Савецкага Саюза таварыша Сталіна ад 24 ліпеня 1943 г. падведзены вынікі адной з вялікіх і жорсткіх бітв Айчыннай вайны па ліквідацыі летняга наступлення немцаў.

Вораг сабраў і кінуў у наступленне на вузкіх участках фронта на Орлоўска-Курскім і Белгародска- Курскім напрамках 17 танкавых, 3 матарызаваных і 18 пяхотных дывізій. Гітлер ускладваў на гэта наступленне вялікія надзеі, лічыў, што гэта наступленне павінна забяспечыць пералом у ходзе вайны ў карысць фашысцкай Германіі.

Слаўная Чырвоная Армія сарвала ўсе планы гітлераўцаў, ліквідавала летняе нямецкае наступленне і сама перайшла ў наступленне. За час баёў з 5 па 23 ліпеня немцы страцілі забітымі больш 70 тыс. салдат і афіцэраў. Нашымі войскамі за гэты час падбіта і знішчана танкаў 2.900, самаходных гармат 195, гармат палявых 844, знішчана самалётаў 1.392 і звыш 5.000 аўтамашын.

Народныя мсціўцы, усе працоўныя! Дапамагайце Чырвонай Арміі граміць нямецкіх акупантаў, біце гітлераўцаў з тыла! Усімі сродкамі знішчайце фашысцкую саранчу, не прапускайце варожыя эшалоны і абозы к фронту, паліце склады, масты, рвіце сувязь, дарогі, нападайце на гарнізоны.

Ні адзін душагуб-гітлеравец не павінен выйсці жывым з беларускай зямлі! Толькі сваей смерцю немцы расплоцяцца за крывавыя злачынствы ў нашым краі!

Смерць за смерць, кроў за кроў!



Хутка сонца заз'яе над намі,
Сустракаць будзем
волі зару.
У чужынцаў ляжаць
пад нагамі
Ты не будзеш, мая Беларусь!
Там, на Ўсходзе,
грыміць кананада,
Ноччу неба гарыць у агні:
Гэта крышуць
фашысцкага гада
Пабрацімы твае і сыны.
Дзень і ноч
ўсё мацнеюць раскаты,
Дзень і ноч
бой без спынку кіпіць:
Гэта час
надыходзіць расплаты,
Гэта гнеў наш
пажарам гарыць.

Беларусь, наша маці — краіна!
Гэта дзень
вызвалення ідзе,
Узнімі-ж ўсю нянавісць і сілу
І абруш па варожай брыдзе.
Няхай помста твая запылае,
Ў кожнай скібе
стаптанай раллі.
Хай нямецкую
набрыдзь змятае
З нашаі роднай,
пакутнай зямлі.
Хутка сонца заз'яе над намі
Сустракаць будзем
волі зару.
У чужынцаў ляжаць
пад нагамі
Ты не будзеш, мая
Беларусь!

жр 3254

# УГАВАРЫЎ...



Страшна фрыцу лезці ў гушчу
Беларускай нашай пушчы.
Пісталет схаваўшы з тылу,
Скорчыў морду надта міла,
І з улесся на паляну
Кліча з лесу партызанаў:
—Партызаны, партызаны,
—Віхадзіце на паляну.
—Мі расстрэліваць не будзем,
—Ві карошы ошень людзі.
—Пабудуем мі вам хаты,
—Будзе кожны жыць багата.
—Зеер гут „парадак новы"—
—Мі дадзём каня, карову
—І зямлі гектар па пяць,
—Толькі кіньце ваяваць.



Ды не кончыў фрыц прамовы,
Пра парадак той свой новы,
Як з-за дрэваў партызаны
Акружылі ўсю паляну.
—Не дзяры дарэмна глотку,
—Наша гутарка каротка,—
—Нам зямлю ты нашу дорыш,
—Нат па пяць гектараў кроіш!
—Мы другое зараз скажам
—І табе і злыдням вашым:
—Маем мы зямлі багата,
—Выйдзе больш у нас на брата.
—Мы даем яшчэ гасцінцам,
—Па тры метры на чужынца.
І, сказаўшы, абступілі,
Скруцілі...



**І прышылі...**

## КРАСАМОЎНАЕ МАЎЧАННЕ

Нямецкі генерал пытае ў обера:

— Пан обер, што гавораць нашы франтавікі об совецкай артылерыі?

— Тыя, што спрабавалі яе агонь, пан генерал, нічога не гавораць, па вельмі важнай прычыне—яны на тым свеце.

## Выдахліся...

Мінская фашысцкая газяцёнка „Мінскер цейтунг" прызнае, што жах перад партызанамі прымушае многіх гітлераўцаў бегчы з Беларусі.



**Ганс:** Нажымай, Вілі, колькі ёсць духу, можа як небудзь выскачым жывымі з гэтага нашага „жизненого пространства".

**Вілі:** Ох, мала надзеі, Ганс! Наш дух ужо не вывязе нас з бяды... Кругом партызаны...

***

### РАСТЛУМАЧЫЎ

—Няведаеш, Карл, які гэта партызанскі атрад разбіў наш гарнізон у горадзе В.?

—Той самы, аб знішчэнні якога нам гаварыў гебітскамісар фон Шмідт яшчэ ў мінулым годзе.

## І шукаць не трэба



Абапал чыгунак грудам ляжаць нямецкія эшалоны. Гэта беларускія партызаны актыўна ўносяць свой „уклад" у папаўненне запасаў металалома для нямеччыны.

## ПРЫПЕЎКІ

Ты кукуй, кукуй зязюля,
На зялёнай на мяжы.
Ты ляці стралою, куля,
Чэрап немцу пранізы.
Каля лесу, ля дарогі
Быў нямецкі вартавы.
А цяпер там толькі ногі
Ды кавалак галавы.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ.